# ТЫ, МОЙ ТАТА, САМЫ ЛЕПШЫ

Прачытайце прыказкі.

- Не так лёгка зрабіць, як сказаць.
- Нічога само не зробіцца.
- Рабі не тады, калі хочаш, а калі можаш.

Як чалавек павінен ставіцца да працы? Якія якасці характару спатрэбяцца, каб выканаць цяжкае заданне? Выберыце патрэбныя словы для адказу: *настойлівасць, гультайства, цярпенне, працавітасць, лянота, упэўненасць, дасціпнасць, хітрасць*.

Касаві́ца — час пакосу травы.

Прачытайце апавяданне і скажыце, якое слова аўтар называе чароўным.

## Чароўнае слова

*Міхась Даніленка*

Ста́сікаў бацька працуе трактарыстам. Цяпер, як пачалася касаві́ца, яго трактар цягне па лузе счэп касілак. Яны страко-

чуць і пакідаюць за сабой шырокую паласу вы́кашанай травы. Стасік, які прынёс бацьку абед, сядзіць пад кустом у цяньку і адмахваецца ад аваднёў. Яны злосна гудуць ля хлопчыка, кру́цяцца — спрабуюць укусіць за руку, за потную шчаку. Хутчэй бы бацька ішоў!

А той робіць новы круг, праязджае паўз сына і прыветліва махае рукой.

— Ці скора, татка? — стара́ючыся перакрычаць шум матора, гукае Стасік.

— Скора, сын! Скора.

— Дранікі і боршч астынуць, — гаворыць Стасік. — А мама нака́звала, каб абед адразу еў.



Нарэшце, зрабіўшы яшчэ адзін круг, бацька спыняе трактар. Ён сыходзіць з машыны, выцірае потны лоб і спяшаецца ў цянёк да куста крушы́ны, дзе чакае Стасік.

— Стаміўся? — пытаецца Стасік.

— Стаміўся, — прызнаецца бацька. — Ды я, брат, знаю чароўнае слова. Яно як рукой стому здымае.

Стасік усхопліваецца, садзіцца на кукішкі і здзіўлена глядзіць на бацьку.

— А што ж гэта за слова такое?

Бацька з апетытам сёрбае боршч. Запівае дранікі малаком і, як на дарослага, глядзіць на сына.

— А слова тое чароўнае — «трэба». Я вось ведаю: трэба скасіць усю дзялянку. Сам зараз падрамлю трохі. А ты павартуй, паглядзі, каб ніхто да машыны не падыходзіў.

Сон зморвае і Стасіка, хіліцца да каленяў галава. Але ён не спіць: помніць бацькава чароўнае слова.

1. Кім працуе тата Стасіка? Што ён рабіў, калі сын прынёс яму абед?
2. Якое слова бацька лічыць чароўным? Як вы думаеце, у чым заключаецца яго незвычайная моц?

3. Знайдзіце і прачытайце ўрывак, з якога можна зразумець, што Стасік навучыўся выкарыстоўваць гэта чароўнае слова.
4. Успомніце і раскажыце, калі і вам дапамагло чароўнае слова «трэба».
5. Прывядзіце прыклады жыццёвых сітуацый, у якіх людзі выкарыстоўваюць гэта слова.

## АБМЯРКОЎВАЕМ ПРАЧЫТАНАЕ

1. Прачытайце ўрыўкі з твораў. Успомніце назвы твораў, з якіх яны ўзяты.

1) «...Разгубілася матуля.
Думу думае: як быць?
Ці хваліць, ці не хваліць?»

2) «Падбег Юра да каменьчыкаў і пачаў падкідаць іх угору. Усім было весела, і кожны каменьчык спяшаўся хутчэй трапіць у рукі да хлопчыка».

3) «Іду з дзядулем крок у крок
Да Вечнага агню святога.
Усе глядзяць на мой сцяжок:
Ён — праўнук Сцяга Перамогі».